УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

УДК 39(=161.3):115]:008-027.21(043.3)

**КАТОВІЧ**
**Аксана Веніямінаўна**

# УВАСАБЛЕННЕ ФЕНОМЕНА ЧАСУ Ў МІФАПАЭТЫЧНАЙ І РЫТУАЛЬНА-АБРАДАВАЙ СПАДЧЫНЕ БЕЛАРУСАЎ

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі

па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

Мінск, 2022

Работа выканана на кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | **Смолік Аляксандр Іванавіч,** доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» |
| Афіцыйныя апаненты: | **Шамякіна Таццяна Іванаўна,** доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| | **Кажухоўская Людміла Сяргееўна,** кандыдат культуралогіі, прарэктар па міжнароднай і навукова-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» |
| Апаніруючая арганізацыя: | **Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»** |

Абарона адбудзецца 3 сакавіка 2022 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацыі Д 09.03.01 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі; e-mail: buk@buk.by; тэл. вучонага сакратара 375-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 2 лютага 2022 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт Т. М. Бабіч

# КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Важным напрамкам сучасных культуралагічных даследаванняў з’яўляецца вывучэнне нацыянальных карцін свету, у якіх адной з асноўных катэгорый светабудовы выступае час. У непадзельнай сукупнасці з катэгорыяй прасторы ён утвараў хранатоп, у межах якога фарміравалася і развівалася культура этнасу. Катэгорыя часу стала ўнікальным сінтэзам старажытнага міфалагічнага светаўспрымання, менталітэту, культурных каштоўнасцяў, сімвалаў, адлюстраваных у міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне. Адсутнасць канцэптуальнай рэпрэзентацыі міфалагічнай карціны свету ў айчыннай культуралогіі пры адначасовай наяўнасці значнай колькасці публікацый, прысвечаных яе асобным элементам, вызначае актуальнасць комплексных даследаванняў традыцыйнай культуры.

Працэсы глабалізацыі вядуць да размывання этнічнай непаўторнасці, нацыянальнай і асабовай ідэнтычнасці. Вывучэнне міфапаэтычнай спадчыны, комплекса рытуальна-абрадавых практык, глыбіннай сутнасці традыцыйнага календара з’яўляецца адным з найважнейшых фактараў кансалідацыі грамадства. Катэгорыя часу становіцца той экзістэнцыянальнай каштоўнасцю, якая паяднoўвае чалавека з прыродна-касмічнымі працэсамі і задае адпаведны тэмпарытм існавання ўсіх сфер жыццядзейнасці чалавека.

У розных філасофскіх канцэпцыях ставіліся фундаментальныя тэарэтычныя пытанні, якія тычыліся анталагічнай дылемы: час – гэта аб’ектыўна існуючая рэальнасць або адна з мысліцельных канструкцый, пакладзеная у аснову разумення карціны свету. Для культуралагічных даследаванняў найбольш важным з’яўляецца феномен часу, які аб’ектываваны ў розных знакавых сістэмах (слова, дзеянне, атрыбут) і адлюстраваны ў шырокім спектры паняццяў (вобраз, форма, канцэпт). У цэнтры нашага даследавання знаходзіцца кола праблем, звязаных з катэгорыяй часу: асаблівасцямі існавання, структурнымі адзінкамі, асноўнымі прыродна-сацыяльнымі якасцямі, спектрам функцый, рэгламентацыямі, каштоўнаснымі характарыстыкамі, якія выразна прадстаўлены ў міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне беларусаў.

Актуальнасць даследавання заключаецца ў выяўленні прыярытэтных кірункаў вывучэння феномену часу як найважнейшай сацыякультурнай каштоўнасці, якая з’яўляецца базісным кампанентам нацыянальнай карціны свету.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі

Тэма дысертацыі адпавядае прыярытэтным кірункам навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг. (паст. Савета Міністраў Рэсп. Беларусь № 190 ад 12.03.2015): п. 13 «Бяспека чалавека, грамадства і дзяржавы», а таксама

Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 г. (пратакол пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэсп. Беларусь № 10 ад 02.05.2017): п. 4.6 «Культура як крыніца духоўнага здароўя нацыі і сацыяльнай стабільнасці». Даследаванне выканана ў рамках комплекснай навуковай тэмы кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» «Тэзаўрус культуры: нематэрыяльная і матэрыяльная гісторыка-культурная спадчына Рэспублікі Беларусь» (зацверджана на пасяджэнні Савета БДУКМ, пратакол № 4 ад 17.12.2020); комплексных навуковых тэм кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» «Сучасная гарадская святочная культура Беларусі: тэндэнцыі развіцця і сродкі мастацкай выразнасці» (зацверджана на пасяджэнні Савета БДУКМ, пратакол № 3 ад 28.10.2015); «Тэатральнае мастацтва і відовішчная культура: традыцыі і навацыі» (зацверджана на пасяджэнні Савета БДУКМ, пратакол № 4 ад 17.12.2020).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэта даследавання* – выяўленне асаблівасцей увасаблення феномена часу ў міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне беларусаў.

Заяўленая мэта абумоўлівае пастаноўку і вырашэнне наступных *задач*:

– вызначыць асаблівасці канстытуіравання феномена часу ў міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне беларусаў;

– выявіць кантэксты актуалізацыі часавай неаднароднасці ў міфапаэтычнай спадчыне і рытуальна-абрадавых практыках беларусаў;

– раскрыць канфігурацыі існавання і тоеснасць каштоўнасных характарыстык структурных элементаў салярнай і месяцовай цыклічнасці;

– ахарактарызаваць сацыякультурныя аспекты суіснавання цыклічнай і лінейнай форм часу ў рытуальна-абрадавых практыках беларусаў і хрысціянскім (праваслаўным) календары.

**Навуковая навізна**

Дысертацыя з’яўляецца першым комплексным культуралагічным даследаваннем феномена часу ў міфапаэтычнай спадчыне і рытуальна-абрадавых практыках беларусаў. У даследаванні ўпершыню вызначаны асаблівасці канстытуіравання феномена часу як сакральнай Вечнасці і прафаннай быційнасці; выяўлены кантэксты абрадавай актуалізацыі часавай неаднароднасці; раскрыты канфігурацыі існавання і тоеснасць каштоўнасных характарыстык рознамаштабных адзінак часу, звязаных з цыклічнасцю Сонца і Месяца; ахарактарызаваны сацыякультурныя аспекты суіснавання цыклічнага і лінейнага часу ў традыцыйных рытуальна-абрадавых практыках і праваслаўнай Пасхаліі хрысціянскага календара. У тэкст уведзены шырокі фальклорна-этнаграфічны матэрыял, сабраны дысертантам у перыяд 1999 – 2019 гг. падчас палявых экспедыцый.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Час – адзін з вызначальных параметраў міфапаэтычнай карціны свету, які мае дваістую прыроду сімвалізацыі. Па-першае, гэта працэсуальная працягласць, якая зафіксавала акт першастварэння свету багамі і трансфармацыю хаоса ў космас. У беларускай міфалогіі ў аснове акта першастварэння знаходзіўся саюз / процістаянне Неба і Маці-сырой зямлі. Па-другое, гэта кансалідаваная памяць соцыуму аб акце першастварэння, адлюстраваная ў касмаганічных і этыялагічных міфах.

Дуальны прынцып светабудовы прадвызначыў асаблівасці існавання асноўных форм канстытуіравання часу. У сферы Паднябесся час першавытокаў набыў статус Вечнасці, якая ў сваю чаргу суадносілася з космапланетарнымі цыкламі нараджэння і аднаўлення. Гарызонт зямной быційнасці чалавека існаваў у плоскаці прафаннага часу, які меў лінейную форму ўвасаблення (нараджэнне – жыццё – смерць). Разам з тым менавіта цыклічная паўтаральнасць міфалагічнага часу ўраўнаважвала існаванне чалавека ў сферы быційнасці і стала для яго гарантам абароненасці, прадказальнасці, стымулявала назапашванне і замацаванне ведаў, якія трансфармаваліся ва ўстойлівую традыцыю. Палярызацыя сакральнага і прафаннага часу знайшла шырокае адлюстраванне ў сістэме каштоўнасных характарыстык існуючых часавых працягласцей (спрыяльны – неспрыяльны). Дыхатамія сакральнага і прафаннага часу з'уляецца гарантам штогадовага абнаўлення космасу, а пускавым механізмам захавання раўнавагі становіцца комплекс каляндарных рытуальна-абрадавых практык.

2. Міфапаэтычная спадчына і рытуальна-абрадавыя практыкі беларусаў сведчаць пра наяўнасць розных форм часу, кожная з якіх праяўляецца ў адпаведных кантэкстах і выконвае пэўную абрадавую функцыю: кампенсатарную (рэверсіўнасць часу), рэгенератыўную (абрад навалецця), «перазапуску» календара (кампрэсія часу), працэсуальнай трансфармацыі (парогавы час), мадальнай палярызацыі каштоўнасных характарыстык, якія падкрэслівалі статусную выключнасць актуалізуемай часавай формы.

Паралельна з гістарычным працэсам дэсакралізацыі міфа існуе цэнтраімклівы вектар часавага вяртання – ад сучаснага фальклорнага дыскурсу да міфалагічных вытокаў. Зваротная міфалагізацыя актуалізуецца ў форме *рэверсіўнасці* часавай плыні, якая ахоплівае трохпакаленны трансляцыйны ланцуг. Асноватворная ідэя абрадаў *навалецця* сфакусіравала ў сабе працэс касмізацыі хаосу, ролю і месца дэміургаў, культурных герояў, першапродкаў у стварэнні і захаванні самога космасу. Функцыю навалецця ў традыцыйным календары беларусаў выконвалі Каляды і Вялікдзень. Прыродныя анамаліі і дэструктыўныя працэсы ў жыцці грамадства абумоўлівалі актуалізацыю спецыяльных рытуальна-абрадавых практык (аказіянальных, аброчных), якія шляхам выкарыстання *кампрэсіі* часу «перазапускалі» каляндарную ўпарадкаванасць з мэтай аднаўлення прыроднай і сацыяльнай гармоніі. У працэсе фарміравання структуры традыцыйнага календара і

абрадаў сямейна-родавай накіраванасці вызначальным маркёрам з’яўляўся *парогавы* час. Ён канстатаваў паэтапнае абнаўленне касмічнай цыклічнасці і змену сацыяльнага статусу чалавека. Апазіцыя *спрыяльны – неспрыяльны,* якая раскрывае дуальны характар акта Першастварэння, стала вызначальнай у адносінах соцыуму да розных форм праяўлення часу, актуалізуемых у кантэксце існуючых рытуальна-абрадавых практык.

3. Галоўнай зместаўтваральнай ідэяй касмаганічнага міфа была непадзельнасць прасторава-часавага кантынуума. Тэмпарытм космапланетарнай цыклічнасці (рух Сонца, Месяца) стаў асновай узнікнення разгорнутай сістэмы традыцыйных адзінак вымярэння часу, асэнсаванне якіх адбываецца па прынцыпе бінарных апазіцый. Чатырохтактная структура сонечнага гадавога (зімовае – летняе сонцастаянні, веснавое – восеньскае раўнадзенствы), месяцовага (маладзік – збыта, поўня – межы), сутачнага цыклаў (усход – захад, поўдзень – поўнач) і выкарыстанне вобраза піраміды дазволілі паказаць не толькі часавую, але і прасторавую (усход – захад, поўдзень – поўнач) тоеснасць каштоўнасных характарыстык і зместавае падабенства рознамаштабных працягласцей, выявіць наяўнасць амбівалентнасці ключавых параметраў прасторава-часавага кантынуума.

4. Сэнсава-сімвалічнай дамінантай увасаблення феномена часу ў сакральным календары беларусаў з’яўляецца пастаянны зварот да вытокаў (цыклічная паўтаральнасць), што служыла гарантам захавання космасу ў становішчы раўнавагі. Хрысціянская канцэпцыя разумення часу пастуліруе лінейную накіраванасць у будучыню, якая пры гэтым не страціла сваёй сувязі з ідэяй космапланетарнай цыклічнасці. У рытуальна-абрадавых практыках беларусаў існуе спецыфічная разнавіднасць лінейнага часу, якая структурыруецца ў адпаведнасці з тэмпарытмам «1-ы, 3-і, 9-ы, 40-ы дзень, 1 год». Сацыякультурныя аспекты актуалізацыі алгарытма гэтай часавай паслядоўнасці паказваюць, што ён уступае ў складаныя ўзаемаадносіны з традыцыйным календаром, падпарадкоўвае сабе паслядоўнае развіццё сямейна-родавых абрадаў і паслявелікоднага сегмента святаў праваслаўнай Пасхаліі.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з’яўляецца вынікам самастойнай навуковай работы і першым культуралагічным даследаваннем феномена часу ў міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне беларусаў. У выніку комплекснага аналізу раскрыты асаблівасці канстытуіравання сакральнай Вечнасці і прафаннага часу зямной быційнасці, вызначана роля рытуальна-абрадавых практык у гарманізацыі іх узаемаадносін. Даследаваны абрадавыя кантэксты актуалізацыі часавай неаднароднасці (рэверсіўнасць, рэгенерацыя, кампрэсія, парогавасць), прааналізаваны асаблівасці суіснавання цыклічнай і лінейнай форм часу ў хрысціянскім (праваслаўным) календары і рытуальна-абрадавых практыках сямейна-родавай накіраванасці. Выяўлена структурная ізаморфнасць традыцыйных адзінак часу, якія суадносяцца з

рознамаштабнымі касмічнымі цыкламі; тоеснасць іх каштоўнасных характарыстык; раскрыта амбівалентнасць прасторава-часавых маркёраў.

**Апрабацыя вынікаў даследавання**

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены на 15 навуковых і навукова-практычных канферэнцыях міжнароднага (13) і рэспубліканскага (2) узроўняў, у тым ліку: на Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Раманаўскія чытанні – 6 (да 75-годдзя гістарычнага факультэта УА "МГУ ім. А. А. Куляшова"» (Магілёў, 24–25 лістапада 2009 г.); VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы» (Гомель, 26–27 мая 2011 г.); VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць» (Магілёў, 29–30 чэрвеня 2011 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці» (Мінск, 12–13 чэрвеня 2012 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Народная художественная культура в контексте процессов глобализации» (Бабруйск, 28–29 чэрвеня 2013 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Духовно-нравственные концепты русской словесности в современной языковой, культурной и образовательной практике Российско-Белорусско-Украинского пограничья» (Навазыбкаў, Расія, 25–26 кастрычніка 2013 г.); XXIII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 22–26 мая 2017 г.); XI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Культура. Навука. Творчасць» (Мінск, 4 мая 2017 г.); III Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе» (Пінск, 30 лістапада – 1 снежня 2018 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Молодежь: свобода и ответственность» (Баранавічы, 28 лютага 2019 г.); VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці», прысвечанай Году малой радзімы ў Рэспубліцы Беларусь (Мінск, 10 кастрычніка 2019 г.); VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Этническая культура в современном мире» (Чэбаксары, Расія, 8 лістапада 2019 г.); XIV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Вялікай Перамогі і 45-годдзю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў «Культура. Навука. Творчасць» (Мінск, 14 мая 2020 г.); VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Современные тенденции развития образования и науки: проблемы и перспективы» (Львоў, Украіна, 16 кастрычніка 2020 г.); Навуковай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага складу БДУКМ «Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва», прысвечанай 45-годдзю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (Мінск, 26 лістапада 2020 г.).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання былі прадстаўлены ў 23 публікацыях: 11 – у навуковых рэцэнзаваных часопісах (7,2 аўт. арк.); 6 – зборніках навуковых

артыкулаў (2,76 аўт. арк.); 6 – зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (1,94 аўт. арк.). Агульны аб’ём публікацый складае 11,9 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Структура дысертацыйнага даследавання прадвызначана логікай вырашэння пастаўленых задач і складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, дадаткаў. Поўны аб’ём дысертацыі складае 211 старонак, з іх 139 старонак займае асноўны тэкст, 18 старонак – бібліяграфічны спіс (222 найменні на беларускай, рускай, англійскай, нямецкай мовах) і спіс публікацый саіскальніка (23 найменні на беларускай і рускай мовах), 54 старонкі складаюць 7 дадаткаў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** аргументаваны выбар тэмы даследавання, яе актуальнасць; абгрунтавана сувязь работы з навуковымі праграмамі і тэмамі; вызначаны мэта і задачы даследавання; сфармуляваны асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону; вызначаецца асабісты ўклад саіскальніка; адлюстраваны звесткі пра апрабацыю вынікаў даследавання і іх апублікаванасць, а таксама структура і аб’ём дысертацыі.

**У Главе 1 «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання феномена часу»** прадстаўлены аналітычны агляд літаратуры па прадмеце даследавання; адлюстраваны навуковыя падыходы і метады даследавання; абгрунтавана мэтазгоднасць выкарыстання паняццяў «форма часу», «вобраз часу».

***У раздзеле 1.1 «Прадмет даследавання ў кантэксце аналітычнага агляду літаратуры»*** вызначаецца ступень распрацаванасці тэмы даследавання.

Тэарэтычныя аспекты асэнсавання ролі міфа ў гісторыі развіцця культуры, спосабаў канстытуіравання часу як найважнейшага элемента этнічнай касмагоніі і светабудовы самым непасрэдным чынам звязаны з вывучэннем архаічнай спадчыны. Семантыку і сімволіку міфапаэтычнай карціны свету розных народаў, непадзельнае суіснаванне часу і прасторы разглядалі Ф. Б. Кёйпер, Л. Леві-Бруль, А. Ф. Лосеў, К. Хюбнер, М. Эліядэ.

Механізм дзейнасці феномена часу ў псіхалогіі чалавека, калі калектыўнае несвядомае выконвае функцыю архетыпічнай памяці на розных этапах існавання чалавецтва, якая выступае надзейным падмуркам уключанасці чалавека адначасова ў тры формы часавай суаднесенасці: мінулае – сучаснае – будучае, дапамагаюць зразумець тэарэтычныя палажэнні псіхааналітычнай канцэпцыі (Э. Гусерль, К. Керэньі, Дж. Кэмпбел, Э. Нойман, З. Фрэйд, К.-Г. Юнг). Праблема феномена часу арыгінальна вырашалася Л. М. Гумілёвым з пазіцый тэорыі пасіянарнасці.

Прадуктыўным напрамкам даследавання культуры з’яўляецца семіятычны аналіз (Ж. Бадрыйяр, Р. Барт, Ч. Морыс, Ч. Пірс, Ф. дэ Сасюр, Б. А. Успенскі), які дазваляе

разглядаць у непарыўнай сувязі знакавыя сістэмы і дамінантныя сімвалы, зразумець іх сэнс і шырокі спектр функцый (Э. Касірэр). Адной з ключавых знакава-сімвалічных сістэм для разумення катэгорыі часу з’яўляюцца міфы і непасрэдна звязаныя з імі рытуалы. У семіятычных даследаваннях (А. А. Залізняк, В. У. Іванаў, Ф. Х. Кесідзі, А. А. Патэбня, У. М. Тапароў) час набывае статус функцыянальнага знака, які ў свядомасці этнасу выконвае канвенцыянальную ролю. У грунтоўных даследаваннях М. Ю. Лотмана разглядаецца семіётыка прасторы ў непасрэднай сувязі з катэгорыяй часу.

Важным кірункам даследавання міфаў, міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыны, праяўлення ў іх феномена часу з’яўляецца вывучэнне структуры элементаў часавага асэнсавання і іх функцый. Гісторыю развіцця міфа і культуры з пазіцый эвалюцыянізму разглядаў Дж. Фрэзер. Ідэі Б. Маліноўскага – заснавальніка метаду структурнага функцыяналізму, які, спалучаючы вопыт палявых даследаванняў і навукова-тэарэтычны аналіз, акцэнтаваў увагу на спектры функцый розных форм і элементаў традыцыйнай культуры, а таксама на цеснай узаемасувязі міфа з магіяй і абрадавымі практыкамі, – атрымалі далейшае развіццё ў працах Я. Э. Галасоўкера, Э. Дзюркгейма, М. С. Еўзліна, К. Леві-Строса, Э. Б. Тайлара і інш.

Гістарычная эвалюцыя міфа як сакральнага тэксту прывяла да дэсакралізацыі архаічнай светапогляднай традыцыі, у выніку чаго ўзніклі шматлікія жанры фальклору, якія атрымалі абагульняючую назву міфапаэтычная спадчына. З пазіцый міфалагічнай школы рускай фалькларыстыкі паэтычныя погляды славян на прыроду разглядаў А. М. Афанасьеў, Ф. І. Буслаеў; гістарычнай школы – А. М. Весялоўскі, Д. К. Зяленін, М. Ф. Сумцоў. Дэсакралізаваны міф і чарадзейныя казкі сталі аб’ектам даследаванняў У. П. Анікіна, Э. В. Памяранцавай. Гісторыка-тыпалагічны і параўнальны аналіз архаічных міфаў розных народаў свету паказаў, што міфы пра культурных герояў маюць пераходны характар паміж уласна міфамі і чарадзейна-гераічнымі казкамі (Е. М. Меляцінскі); у аснове генезісу чарадзейных казак ляжыць абрад ініцыяцыі (У. Я. Проп).

Фундаментальныя даследаванні Б. А. Рыбакова прысвечаны вытокам славянскай міфалогіі, шляхам фарміравання традыцыйнага календара і сістэме яго рытуальна-абрадавых практык; Н. І. Талстога і С. М. Талстой – тэарэтычнаму асэнсаванню старажытнаславянскай міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыны. Для разглядаемай намі праблемы важную ролю выконваюць даследаванні Т. А. Агапкінай (структурна-семантычны аспект вясенне-летняга сегмента славянскага народнага календара), Н. А. Крынічнай (аналіз персанажаў міфалогіі і дэманалогіі, часу іх камунікацыйных кантактаў з чалавекам).

У кантэксце еўрапейскай супольнасці беларуская міфапаэтычная і рытуальна-абрадавая спадчына з’яўляецца важнай і непаўторнай складовай, якая захавала значную колькасць архаічных тэкстаў і ўнікальных рытуальна-абрадавых практык. Вялікую цікавасць уяўляюць грунтоўныя зборы казак У. М. Дабравольскага,

М. Я. Нікіфароўскага, Е. Р. Раманава, А. К. Сержпутоўскага, П. М. Шпілеўскага, П. В. Шэйна. Адначасова з мэтанакіраванай збіральніцкай дзейнасцю (50-томнае выданне «Беларуская народная творчасць») пачалося навуковае даследаванне фальклорнай спадчыны беларусаў. Да іх шэрагу неабходна аднесці працу А. Я. Багдановіча, у якой разглядаецца культ сонца, рэшткі анімізму, магічныя сродкі народнай медыцыны. Кола праблем ўзаемасувязі міфаў з рознымі жанрамі фальклору аналізуе Т. І. Шамякіна. Тэарэтычныя высновы, якія тычацца даследавання розных аспектаў беларускай міфапаэтычнай спадчыны ў параўнанні з духоўнымі традыцыямі іншых народаў свету, прысутнічаюць у працах культуролагаў У. М. Конана, М. І. Крукоўскага, І. В. Марозава, П. Г. Мартысюка, А. І. Смоліка. Архаічныя гарызонты міфасемантыкі і міфарытуальных практык даследавалі Т. В. Валодзіна, У. А. Васілевіч, Л. С. Кажухоўская, І. В. Казакова, У. А. Коваль, А. С. Ліс, А. М. Ненадавец, У. М. Сысоў, А. С. Фядосік і інш. Даследаваннем асобных структурных адзінак часу ў прасторы беларускага народнага календара займаліся І. У. Вуглік, А. В. Катовіч, І. І. Крук, А. Ю. Лозка.

Важнае месца ў дысертацыйным даследаванні займаюць уласныя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, якія дазваляюць прасачыць эвалюцыю светапоглядных уяўленняў, пашырыць арэал бытавання рытуальна-абрадавых практык, дапоўніць каштоўнасныя характарыстыкі часавых працягласцей, удакладніць і падмацаваць тэарэтычныя палажэнні.

***У раздзеле 1.2 «Метадалогія і катэгарыяльны апарат даследавання»*** абгрунтаваны і сістэматызаваны навуковыя падыходы і метады даследавання; даецца тэарэтычнае асэнсаванне паняццяў «форма часу», «вобраз часу», разглядаюца кантэксты іх выкарыстання ў культуралогіі, філасофіі, этналінгвістыцы.

Тэарэтыка-метадалагічнай асновай дысертацыйнага даследавання сталі навуковыя палажэнні і фундаментальныя працы ў галіне культуралогіі, міфалогіі, філасофіі, семіётыкі, этнаграфіі, фалькларыстыкі беларускіх і замежных навукоўцаў.

У аснову даследавання пакладзены *культуралагічны падыход*, які дазволіў разгледзець феномен часу як базавую кампаненту міфапаэтычнай карціны свету, якая мае гістарычную, культурную, сацыяпрагматычную каштоўнасць і выконвае этнакансалідуючую функцыю.

Прымяненне *комплекснага падыходу* дазволіла ўсебакова разгледзець феномен часу ў плане гістарычнай эвалюцыі, неаднароднасці абрадавага ўвасаблення, суіснавання цыклічнага і лінейнага часу ў розных каляндарных сістэмах, уплыву рознамаштабнай рытмічнасці часу на ўсе сферы жыццядзейнасці соцыуму.

Наяўнасць адзінай мадэлі структурыравання розных касмічных рытмаў, тоеснасць каштоўнасных характарыстык традыцыйных адзінак вымярэння часу, зыходная непадзельнасць прасторава-часавага кантынуума былі разгледжаны як структурная і функцыянальная цэласнасць з пазіцый *структурна-функцыянальнага падыходу.*

Тэарэтычныя палажэнні *псіхааналітычнай канцэпцыі* далі магчымасць выявіць шляхі актуалізацыі розных форм часу ў межах традыцыйнай каляндарнай сістэмы; тэарэтычныя палажэнні *канцэпцыі класічнай сацыялогіі* – раскрыць асаблівасці суіснавання цыклічнай і лінейнай форм часу ў кантэксце суадносін каляндарных і сямейна-родавых абрадаў; на аснове палажэнняў *фенаменалогіі культуры* разглядаюцца міфалагічныя ўяўленні аб феномене часу, асаблівасці дыхатаміі сакральнае – прафаннае, фарміраванне каштоўнасных характарыстык розных часавых працягласцей, адлюстраваных у міфапаэтычнай спадчыне і рытуальна-абрадавых практыках беларусаў.

Для дасягнення пастаўленай мэты і задач даследавання былі выкарыстаны *метад сістэмнага аналізу*, які дазволіў прааналізаваць якасці, формы, асаблівасці існавання часу ў міфапаэтычнай і міфарытуальнай спадчыне беларусаў; *метады палявых даследаванняў і непасрэднай уключанасці ў фальклорны дыскурс* выкарыстоўваліся падчас збору эмпірычнага матэрыялу з мэтай усебаковага разгляду кантэкстаў праяўлення неаднароднасці абрадавага часу і ступені захаванасці каштоўнасных характарыстык адзінак часу на сучасным этапе існавання традыцыі. У працэсе даследавання выкарыстоўваліся метады, якія характарызуюць працэс пазнання ў цэлым: *аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, сінхронны і дыяхронны, абстрагіраванне і абагульненне.*

Даследаваннем канцэпту часу займаліся прадстаўнікі розных навуковых дысцыплін, што прывяло да ўзнікнення пэўнага кола паняццяў, якія адлюстроўваюць спецыфіку разглядаемага аб’екта. У сусветнай навуковай традыцыі стала інструментальнай аксіёмай разглядаць асноватворныя элементы міфалагічнай карціны свету у той паслядоўнасці, калі першую пазіцыю займае канцэпт прасторы – прасторава-часавы кантынуум. На пачатку ХХ ст. у навуковы зварот уваходзіць тэрмін «хранатоп» (А. А. Ухтомскі). Разам з тым у навуковай традыцыі пастаянна акцэнтуецца ўвага на прынцыповай непадзельнасці асноўных элементаў светабудовы (Э. Касірэр, М. Ф. Косараў, М. М. Макоўскі, А. І. Пігалеў). Культуралагічныя даследаванні міфалагічнага часу раскрываюць шэраг яго адметных прызнакаў: працягласць, цыклічнасць, незваротнасць і інш., якія знаходзяцца ў самай цеснай сувязі з космапланетарнымі працэсамі. Рытуальна-абрадавыя практыкі традыцыйнага календара сведчаць, што ў іх прасторы час мае свае спецыфічныя ўласцівасці: ён можа назапашвацца, акумулявацца, наслойвацца. Даследаванні часу, якія праводзіліся з улікам тэорыі адноснасці А. Эйнштэйна, значна дапоўнілі класічную мадэль часу шэрагам фізічных якасцяў (шматмернасць, разгалінаванасць, зваротнасць). Этналінгвістычныя даследаванні паказваюць, што канцэпт часу характарызуецца паняццямі «мяжы», «піку», «лёсавызначальнасці», а час сутак можа ўспрымацца ізаморфным часу жыцця чалавека (С. М. Талстая). Эмпірычны матэрыял палявых даследаванняў пашырае каштоўнасныя характарыстыкі часу (добры, кепскі, спрыяльны, неспрыяльны).

Важнай праблемай даследавання з’яўляецца інтэрпрэтацыя часавых увасабленняў у адпаведных катэгорыях. Паколькі міф і фальклор аперыруюць слоўнымі сродкамі выразнасці, то ўслед за літаратуразнаўцамі ў самым абагульняючым плане культуролагі таксама выкарыстоўваюць ключавое паняцце «вобраз часу» (М. М. Макоўскі, А. І. Пігалеў, С. М. Талстая). Больш складаным з’яўляецца пытанне вызначэння фармальных прыкмет часавага ўвасаблення. Пры ўсёй супярэчлівасці працэса звядзення ў адно цэлае суб’ектыўных вызначэнняў разумення часу і аб’ектываваных часавых характарыстык з дапамогай вобразных, слоўна-знакавых і сімвалічных сродкаў увасаблення культуролагі прытрымліваюцца традыцыі карыстаца паняццем «форма часу» (М. М. Бахцін, Э. Касірэр, Д. С. Ліхачоў, А. І. Пігалеў, Ч. С. Пірс, А. А. Ухтомскі, М. Эліадэ). Акрамя таго навукоўцы выкарыстоўваюць фармалізаваныя вобразы часу: «кола часу» – увасабленне цыклічнасці; «страла часу» і «рака часу» як сімвалізацыя лінейнай працягласці.

**Глава 2 «Час як універсальная катэгорыя міфалогіі»** прысвечана разгляду асаблівасцей існавання часу ў сферы Паднябесся (Вечнасць) і зямной быційнасці чалавека (прафанны час); абрадавым кантэкстам актуалізацыі спецыфічнага камунікацыйнага канала, які выконваў функцыю аднаўлення сакральнага часу.

***У раздзеле 2.1 «Трансцэндэнтная сутнасць і цыклічная паўтаральнасць міфалагічнага часу»*** разглядаюцца працэсуальныя аспекты ўзнікнення часу Паднябесся як выніку дзейнасці багоў і штогадовая неабходнасць яго аднаўлення з мэтай утрымання свету ў становішчы раўнавагі.

Архаічныя міфы маніфестуюць два аспекты асэнсавання часу эпохі першастварэння. У адным выпадку ў цэнтры ўвагі аказваецца працэсуальная дзейнасць небажыхароў – акт касмізацыі хаосу, у выніку якога час становіцца адным з першаэлементаў светабудовы. У другім – касмаганічны міф як сакральны тэкст, рэцытацыя якога адбываецца ў рытуале, адлюстроўвае калектыўную памяць аб міфалагічным акце першастварэння.

Лейтматывам касмаганічных міфаў з’яўляецца дуальны прынцып светабудовы. Процістаянне Неба і Маці-Сырой зямлі мела ўсеахопны характар і самым непасрэдным чынам адбілася на фарміраванні каштоўнасных характарыстык часу. Рэфрэн-хранонім міфалагічных тэкстаў «гэта было тады, як сам Бог па зямлі хадзіў» становіцца сімвалічным увасабленнем «залатога веку». Значна пазней нябесная і зямная сферы былі разведзены па супрацьлеглых каштоўнасных полюсах. Узнікае фундаментальная апазіцыя «сакральная Вечнасць і прафанная быційнасць», якая стала асноватворнай у свядомасці продкаў і была спраецыравана на ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека. Дыхатамія сакральнага і мірскога становіцца гарантам рытмічнага абнаўлення космасу.

Выключнай асаблівасцю міфалагічнага мыслення было разуменне Вечнасці як цэлакупнай, роўнавялікай і пастаяннай велічыні, аднак пры гэтым яе ўспрыманне і асэнсаванне абапіралася на ідэю прыродна-касмічнай цыклічнасці і адвечнай

паўтаральнасці аднойчы зададзенага рытму. Міфы паказваюць, што ў аснову прыроднага чаргавання этапаў памірання і адраджэння свету была пакладзена космапланетарная цыклічнасць Сонца і Месяца, якая ў рэшце рэшт стала асновай структурнай упарадкаванасці традыцыйнага календара. Неабходна адзначыць, што цыклічная паўтаральнасць космапланетарных працэсаў выконвала важную сацыякультурную функцыю: яна аказалася для чалавека гарантам абароненасці, прадказальнасці, спрыяла назапашванню і замацаванню жыццёва важных ведаў, якія трансфармаваліся ў непарушную этнічную традыцыю.

***У раздзеле 2.2 «Актуалізацыя рытуальна-абрадавых практык у кантэксце дыхатаміі сакральнага і прафаннага часу»*** разглядаецца суаднесенасць гарызонтаў міфапаэтычнай карціны свету з сакральным і прафанным часам; роля рытуальна-абрадавых практык у падтрыманні гармоніі суіснавання сферы Паднябесся і зямной быційнасці чалавека.

Міфалагічная свядомасць задавала каштоўнасную іерархію ў вертыкальнай структуры карціны свету: сфера жыццядзейнасці чалавека маркіравалася як апазіцыя Паднябессю. Асноўным крытэрыем структурнага пазіцыянавання было супрацьпастаўленне дзвюх форм часу – міфалагічнага (сакральнага) і прафаннага. Міфалагічны час – час першавытокаў, які звязаны з працэсам узнікнення свету і неабходнасцю яго штогадовага (цыклічнага) абнаўлення. Жыццядзейнасць соцыуму разгортваецца ў прафанным часе, які меў лінейны характар увасаблення. Прафанны час ёсць побытавая рэальнасць, якая падкрэслівае статуснасць сакральнага, гэта тое сэнсавае поле, у межах якога сакральнае праяўляе сябе як непаўторная этнакультурная каштоўнасць. Асаблівую цікавасць прадстаўляе механізм пранікнення або ўкліньвання сакральнага ў сферу прафаннага.

У аснове дыхатаміі часавых плыняў ляжаў архаічны рытуал, які фактычна з'яўляўся ўвасабленнем старажытнага міфа. Сістэма каляндарных рытуалаў выконвала найважнейшую камунікатыўную функцыю ўніверсальнага трансфера паміж Небам і Зямлёй. Народны каляндар беларусаў шляхам паэтапнай актуалізацыі рытуалаў імкнуўся ўтрымліваць космас і соцыум у сітуацыі раўнавагі і гарманічнага ўзаемасуіснавання. У кантэксце рытуальна-абрадавых практык сакральны час правобразаў, аднаўляючы міф першастварэння, з'яўляўся бясконцым «рэхам мінулага» (А. М. Панчанка), аднак пры гэтым міфічнае мінулае так і заставалася па-за часам прафаннага.

**Глава 3 «Неаднароднасць часу ў міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне беларусаў»** раскрывае формы (рэверсіўнасць, рэгенерацыю, кампрэсію, парогавасць) і якасці (спрыяльны, неспрыяльны) увасаблення часу ў рытуальна-абрадавых практыках каляндарнай і сямейна-родавай накіраванасці.

***У раздзеле 3.1 «Рэверсіўнасць часу: працэс дэсакралізацыі міфа і сакралізацыі сучаснага фальклорнага дыскурсу»*** раскрываецца этнакультурная тэндэнцыя двухвектарнага існавання часу: архаічны міф страчвае свой свяшчэнны статус, а

цяперашнія носьбіты традыцыі захоўваюць інтэнцыю вяртання да міфалагічных вытокаў.

Фальклорныя тэксты канстытуіруюць сакральны статус міфалагічнага часу і сведчаць, што кола дэміургаў Паднябесся знаходзіцца па-за каардынатамі часу. Час быццам бы застыў і адлюстроўвае той «узрост» дэміурга, у якім ён знаходзіўся на момант распачатай касмізацыі хаосу. Гістарычнае дыстанцыраванне ад часу Першастварэння, затуханне працэсу «рэхавай» хвалі, важныя змены ў грамадскай свядомасці сталі прычынай узнікнення тэндэнцыі дэсакралізацыі міфа. Гэты працэс непазбежна адлюстраваўся ў ланцугу статуснай трансфармацыі сакральнага тэксту: міф – казка – паданне – сучасны фальклорны дыскурс.

Міфапаэтычная спадчына заўсёды абапіралася на аўтарытэт захавальнікаў традыцыі або «часу праўды». У іх свядомасці ўзнікае сустрэчная этнакультурная тэндэнцыя: жадаючы статусна ўзвысіць сучасны фальклорны дыскурс, яны распачынаюць зваротны працэс – яго сакралізацыю. Ключавую ролю ў гэтым працэсе выконвае рэверсіўнасць часу: носьбіты фальклору свядома або падсвядома пачынаюць узнаўляць ланцуг трохпакаленнай пераемнасці («нашым дзядам і прадзедам іх дзяды і бабкі апавядалі»), заглыбляючыся ў гістарычнае мінулае, аднаўляючы веды папярэдніх пакаленняў і тым самым максімальна набліжацца да міфалагічных вытокаў.

***У раздзеле 3.2 «Каляндарныя абрады навалецця як сімвалічнае аднаўленне касмічнага году»*** разглядаюцца рытуальна-абрадавыя практыкі, якія выконвалі функцыю касмізацыі хаосу.

Сакральны каляндар этнасу праяўляе сябе перш за ўсё ў кантэксце лакальна-рэгіянальнай традыцыі, у кожнай з якіх існуе свята, якое вызначае стадыяльную мяжу паміж завяршэннем каляндарнага года і пачаткам наступнага. Абрад навалецця факусіраваў у сабе ідэю абнаўлення свету, раскрываў мадэль дзейнасці чалавека, набліжаную да касмаганічнага тварэння міфалагічных багоў. У гісторыі развіцця беларускага народнага календара склалася ўнікальная па сваёй сутнасці з’ява – фактычна два рытуальна-абрадавыя комплексы маніфестуюць ідэю навалецця: Каляды і Вялікдзень. У кожным з іх прысутнічаюць базавыя маркёры завяршэння старога і распачынання новага гадавога цыкла. Тое, што сегмент календара, які ахоплівае перыяд часу ад зімовага сонцавароту да веснавога раўнадзенства, утрымлівае ідэю навалецця, стала вынікам дыялогу культур у часы распаўсюджання хрысціянства (наяўнасць адпаведнай маркіроўкі традыцый: калядоўшчыкі і валхвы з віфлеемскай зоркай, валачобнікі і велікоднае яйка).

***У раздзеле 3.3 «Рэгенератыўная функцыя кампрэсіі часу ў працэсе гарманізацыі суіснавання космасу і чалавека»*** разглядаюцца ўнікальныя рытуальна-абрадавыя практыкі, якія скіраваны на падтрымку прыроднай і сацыяльнай раўнавагі.

У народнай свядомасці высокім семіятычным статусам былі надзелены традыцыя абракання і аказіянальныя абрады, якія непасрэдна не ўключаны ў

штогадовую сістэму каляндарных падзей і актуалізуюцца ў адпаведнасці з калектыўным рашэннем толькі ў экстрэмальных сітуацыях. Намаганнямі асоб, якія адпавядалі сацыянарматыўным патрабаванням рытуалу, уключаўся механізм кампрэсіі або сімвалічна-працэсуальнага сціскання абрадавага часу. Калі анамальныя прыродныя ўмовы ставілі пад пагрозу ўраджай, соцыум прымаў рашэнне аб «прыпыненні» выпрацаванай паслядоўнасці падзей каляндарнага года і шляхам прымусовага ўключэння ў яго структуру дадатковай рытуальна-абрадавай практыкі «перазапускаў» вякамі вызначаны традыцыйны святочны парадак. У гэтым выпадку актуалізацыя аказіянальнай абрадавай практыкі надзяляецца статусам навалецця. Феномен кампрэсіі часу шырока прадстаўлены ў замовах лекавага характару, валачобных і калядных песнях.

***У раздзеле 3.4 «Структурна-функцыянальныя аспекты актуалізацыі парогавага часу ў абрадах пераходнага тыпу»*** разглядаецца форма абрадавага часу, якая фіксавала кульмінацыю парадкавання светабудовы або канстатавала знакавы момант у працэсе трансфармацыі сацыяльнага статусу асобы.

Актуалізацыя рытуальна-абрадавай практыкі заўсёды адбываецца ў межах сакральнага хранатопу, у якім існуе вызначальны парогавы момант (пік абрадавага часу), калі час і прастора зліваюцца ў функцыянальнае цэлае і пазначаюць завяршэнне працэсу статуснай трансфармацыі. Парогавы час з’яўляецца вызначальным космапланетарным маркёрам у фарміраванні структуры традыцыйнага календара, а таксама выразна праяўляецца ў сямейна-родавай абраднасці беларусаў: на вяселлі (калі жаніх на руках уносіў нявесту ў хату або калі нявеста пакідала бацькоўскі дом), у комплексе радзінна-хрэсьбінных рытуалаў (калі хросныя перадавалі хрэсніка бацькам), у пахавальным абрадзе (перад тым як вынесці труну з нябожчыкам з хаты, яе тройчы апускалі на парог).

***У раздзеле 3.5 «Палярызацыя каштоўнасных характарыстык часу»*** паказана, што дуальны прынцып касмізацыі хаосу стаў асноватворным не толькі ў працэсе фарміравання міфапаэтычнай карціны свету, але і ў размежаванні гарызонтаў Паднябесся і зямной быційнасці, што знайшло выразнае адлюстраванне ў сэнсава-семантычных аспектах палярызацыі каштоўнасных характарыстык часу. Своеасаблівымі архітэктанічнымі скрэпамі асэнсавання рознамаштабных часавых працягласцей сталі ключавыя бінарныя апазіцыі *добры – кепскі, шчаслівы – нешчаслівы, «урэмя – няўрэмя», спрыяльны – неспрыяльны*. Структурнае процістаянне і каштоўнасная палярызацыя ахоплівала вертыкальную іерархію (верх – ніз, сакральнае – прафаннае) і гарызантальную суаднесенасць (*правае – левае, мужчынскае – жаночае, сваё – чужое*), якія выразна адлюстраваны ў касмаганічных і этыялагічных міфах, рытуальна-абрадавых практыках, шырока прадстаўлены ва ўсіх сферах жыццядзейнасці чалавека.

**Глава 4 «Канфігурацыі існавання часу ў міфапаэтычнай спадчыне і рытуальна-абрадавых практыках беларусаў»** прысвечана аналізу існуючых адзінак вымярэння часу і вызначэнню іх зместавага падабенства; разгляду

асаблівасцей суіснавання цыклічнага і лінейнага часу ў сямейна-родавых абрадах, традыцыйным і хрысціянскім (праваслаўным) календарах.

***У раздзеле 4.1 «Зместава-функцыянальная сінхранія структурыравання часу касмічных цыклаў»*** разглядаецца іерафанія Сонца і Месяца як першааснова прыроднай цыклічнасці часу; праведзены аналіз структурных элементаў штогадовай, сутачнай і месяцовай цыклічнасці; раскрыта міфасемантыка чатырохтактнай прыродна-касмічнай тэмпаральнасці на аснове каштоўнасных характарыстык.

Сістэма існуючых часавых працягласцей паказвае, што Сонца задавала праекцыю вялікага касмічнага рытму, у адпаведнасці з якім фарміравалася матрыца прыродай дэтэрмінаваных сегментаў календара. Менш працяглы па часе і больш дынамічны рытм змены фаз Месяца аказаў выразны ўплыў на шматлікія сферы чалавечай дзейнасці. У беларускай міфапаэтычнай спадчыне Сонца і Месяц надзялялі рысамі людзей, тлумачылі іх непадзельнасць пэўнай ступенню сваяцтва.

Каштоўнасныя характарыстыкі структурных адзінак сутак паказваюць, што іх креставая напоўненасць прадвызначана зыходнай касмаганічнай дуальнасцю светабудовы: бінарныя апазіцыі сфарміраваліся не толькі па прынцыпе палярнай процілегласці (усход – захад, поўнач – поўдзень), а і ў адпаведнасці з іх парным процістаяннем, калі маркёры «ўсход і захад» (вызначаліся як станоўчыя для жыццядзейнасці чалавека) знаходзяцца ў апазіцыі «поўначы і поўдню» (як пераходнаму, небяспечнаму часу).

Міфапаэтычная спадчына беларусаў адлюстравала дуальнасць характарыстык і ў дачыненні да месяцовай візуалізацыі: фазы серпавіднага Месяца («маладзік», «растучы» і «старык», «збыта») сімвалізавалі мужчынскі пачатак, «поўня» стала ўвасабленнем жанчыны. Зместавы аспект характарыстык месяцовых фаз цалкам карэліраваўся з бінарнай апазіцыяй «мужчынскае – жаночае» як супрацьпастаўленне спрыяльнага і неспрыяльнага часу. Адсутнасць Месяца на небасхіле – «межы» – канстатавала гендэрную непраяўленасць і лічылася пераходнай, неспрыяльнай фазай.

Выкарыстанне выявы піраміды, у аснову якой пакладзены квадрат, дазволіла раскрыць структурную суаднесенасць сегментаў існуючых касмічных цыклаў і тоеснасць іх каштоўнасных характарыстык. Кожны ярус у напрамку ад асновы да яе вяршыні маркіруе касмічныя цыклы, розныя па сваёй часавай працягласці. Пачатковы ярус піраміды адлюстроўвае гадавы рух Сонца, які задае змену пораў года і абумоўлівае дыхатамію прафаннага і сакральнага часу. Наступны ярус адпавядае цыклічнасці Месяца, з чатырохфазавай зменлівасцю якога звязана значная колькасць прадпісанняў і забаронаў, рэгламентуючых усе сферы жыццядзейнасці чалавека. На вяршаліне піраміды знаходзіцца найменшая часавая працягласць – чатырохтактная структура сутак – згорнутая праекцыя салярнай гадавой цыклічнасці.

Прынцып пірамідальнага «ўкладвання» рознамаштабных цыклаў салярнай і месяцовай цыклічнасці даў магчымасць дапасаваць да часавых каардынат прасторавыя: чатыры грані піраміды вызначаюць адпаведныя бакі свету. У

міфалагічнай свядомасці беларусаў непадзельнасць каардынатаў кантынуума праяўлена надзвычай выразна: часавыя намінацыі структуравання сутак аказваюцца цалкам тоесныя назвам бакоў свету (усход, поўдзень, захад, поўнач), што з’яўляецца пераканаўчым сведчаннем наяўнасці прасторава-часавай амбівалентнасці.

***У раздзеле 4.2 «Асаблівасці структурнага ўпарадкавання сакральнага часу ў сямейна-родавых абрадах беларусаў»*** разглядаецца спецыфічны рытм, які стаў матрычнай дамінантай паэтапнага разгортвання ў часе асноўных рытуалаў пераходу.

Выключнасць абрадавай тэмпаральнасці «1-ы, 3-і, 9-ы, 40-ы дзень, 1 год» заключаецца ў тым, што яна не карэліруецца з асноўнымі космапланетарнымі рытмамі, аднак пры гэтым надзелена сакральным статусам. Фальклорна-этнаграфічныя крыніцы, матэрыялы ўласных экспедыцый выразна паказваюць асаблівасці канстытуіравання разглядаемага часавага феномена ў радзінна-хрэсьбінных, вясельных і пахавальна-памінальных абрадах. Пры гэтым спецыфічнасць гэтай абрадавай тэмпаральнасці праяўляецца ў характары ўзаемаадносін з сістэмай каляндарнага часу. Шматэтапны комплекс вясельных абрадаў падпарадкоўваўся маральна-этычным каштоўнасцям народна-праваслаўнага календара, перш за ўсё цыклу пастоў. Радзінна-хрэсьбінны комплекс абрадавых падзей суадносіўся з духоўнымі дэтэрмінантамі хрысціянскага календара. Комплекс пахавальна-памінальных абрадаў надзяляўся надзвычайным статусам, які фактычна адмяняў магчымасць удзелу членаў сям’і памёршага ў любым іншым святкаванні.

***У раздзеле 4.3 «Суіснаванне цыклічнага і лінейнага часу ў беларускім традыцыйным і хрысціянскім (праваслаўным) календарах»*** разглядаюцца асаблівасці узаемаадносін паміж дзвюма прынцыпова адрознымі формамі парадкавання часу.

У традыцыйным усходнеславянскім летазлічэнні кропкай адліку існавання чалавецтва лічылі той міфалагічны час, калі быў створаны свет – эра ад Утварэння свету. Кожны чарговы год успрымаўся цалкам паўтораным актам першастварэння або новым цыклам касмізацыі хаосу. Стваралася сітуацыя арганічнага суіснавання прыродна-сацыяльнай цыклічнасці і індывідуальнай вектарнасці часавай плыні, якая адлюстроўвала нараджэнне, жыццё і смерць чалавека. Згодна хрысціянскай традыцыі цыклічная ўпарадкаванасць часу саступіла месца лінейнай накіраванасці ў будучыню – пачалася эра ад нараджэння Хрыста. У хрысціянскім календары (цыклічным у сваёй аснове) духоўнай дамінантай стала Ўваскрэсенне Хрыста – Вялікдзень, вакол якога сфарміраваўся лінейны дваццацітыднёвы цыкл Пасхаліі. Ён стаў выключэннем з каляндарнай сістэмы цыклічнага асэнсавання часу і фактычна атрымаў статус часу першастварэння (часу над часам, Вечнасцю). Вынікам шматвяковага ўплыву Пасхаліі на структуру традыцыйнага календара стала з’яўленне ў ім фактычна дзвюх падсістэм часавай упарадкаванасці, адна з якіх аб’ядноўвае цыкл рухомых свят (залежных ад дня святкавання Вялікадня), а другая – нерухомых. У сваю чаргу, абрадавая тэмпаральнасць «1-ы, 3-і, 9-ы, 40-ы дзень, 1 год» традыцыйных рытуальна-абрадавых практык знайшла адлюстраванне ў структуры праваслаўнай Пасхаліі – у цеснай знітаванасці Вялікадня – Радаўніцы – Узнясення.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Феномен часу, увасоблены ў міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне беларусаў, уяўляе сабой складаную, сістэмна і структурна ўпарадкаваную з'яву, якая на розных гістарычных этапах выконвала этнакансалідуючую функцыю. Час эпохі першастварэння адлюстроўваў дзве плоскасці асэнсавання. У адным выпадку пастуліруецца працэсуальны план светабудовы – тая часавая працягласць, якая маркіравала касмізацыю хаоса. У другім – увасабленнем памяці аб акце першастварэння сталі касмаганічныя і этыялагічныя міфы, якія транслíраваліся ад багоў і культурных герояў да першапродкаў і захаваліся ў сістэме абрадавых практык традыцыйнага календара беларусаў.

У міфапаэтычнай спадчыне саюз / процістаянне Неба і Маці-сырой зямлі меў універсальны характар. Фундаментальная апазіцыя Творца і яго антаганіста стала асноватворнай у свядомасці продкаў і была спраецыравана на ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека. Пад яе ўплывам фарміраваліся базавыя ўяўленні аб часавай упарадкаванасці (Вечнасць – быційнасць, сакральнае – прафаннае, цыклічнае – лінейнае) і каштоўнасныя характарыстыкі ўсіх часавых працягласцей (спрыяльны – неспрыяльны).

Міфалагічная Вечнасць асэнсоўвалася як сімвал прачасу, першавытокаў, непадзельнасці і нерухомасці. Разам з тым яна суадносілася з космапланетарнай рытмічнасцю, таму вымагала штогадовага абнаўлення. Цыклічная паўтаральнасць міфалагічнага часу аказалася для чалавека гарантам абароненасці, прадказальнасці, спрыяла назапашванню і замацаванню жыццёва важных ведаў, што стала асновай для ўзнікнення традыцыі. Прафанная дзейнасць чалавека працякала ў адпаведнасці з лінейным вектарам часу, што паўплывала на ўзнікненне эсхаталагічных міфаў. Кожная з існуючых сфер не была замкнёнай, наадварот, абрадавыя практыкі прадугледжвалі рэгламентаваную ўзаемапранікальнасць. Місія стварэння космасу замацавана за пантэонам нябесных багоў, а роля захавальніка касмічнай упарадкаванасці належала чалавеку. Шляхам актуалізацыі рытуалаў, якія выконвалі функцыю часавага камунікацыйнага канала, падтрымлівалася гарманічнае суіснаванне космасу і соцыуму [3; 9; 10; 22].

2. Час у міфапаэтычнай спадчыне і рытуальна-абрадавых практыках беларусаў характарызуецца як неаднародны, рознанакіраваны і шматслойны феномен, паміж формамі ўвасаблення якога існуюць складаныя карэляцыі. Вызначальнай складовай гэтых узаемаадносін з'яўляецца сацыяпрагматыка рытуальна-абрадавых практык.

У свядомасці суб'ектаў міфалагічнай традыцыі існуюць два рознанакіраваныя часавыя вектары – цэнтрабежны і цэнтраімклівы, якія факусіруюць у сабе кампенсаторную функцыю *рэверсіўнасці* часу. З аднаго боку, прасочваецца працэс

дэсакралізацыі міфалагічных тэкстаў і іх трансфармацыі ў казку, легенду і паданне, з другога – калектыўнае несвядомае імкнецца захаваць тэндэнцыю сакралізацыі сучасных фальклорных дыскурсаў. Абавязковай умовай актуалізацыі зваротнага вектару часу з’яўляецца стварэнне як мінімум трохпакаленнага ланцуга трансляцыі: сучасны носьбіт – продкі – першапродкі.

Пачатак новага гадавога цыкла непазбежна ініцыіраваў вяртанне да часу вытокаў. Функцыю рэгенерацыі касмічнага бязладдзя выконваў абрад *навалецця,* які факусіраваў у сабе працэс абнаўлення свету (падзаводкі) і раскрываў мадэль дзейнасці чалавека, максімальна набліжаную да акта Першастварэння. У беларускім традыцыйным календары фактычна два рытуальна-абрадавыя комплексы маніфестуюць ідэю навалецця: *Каляды* і *Вялікдзень*.

Выключныя прыродныя і сацыяльныя сітуацыі вымагалі актуалізацыі спецыяльных (аказіянальных, аброчных) абрадаў, якія выконвалі ролю перазапуску каляндарнай цэласнасці. Шляхам рытуальнай *кампрэсіі* часу абрад аднаўляў антрапакасмічную гармонію.

У рытуальна-абрадавых практыках сямейна-родавай накіраванасці, як правіла, існуе лімінальная зона, у межах якой актуалізуецца *парогавы* час як абавязковы фактар працэсуальнай трансфармацыі сацыякультурнага статусу галоўных персанажаў. У структуры каляндарных абрадаў парогавы час маніфестуе моманты пераходу Сонца ў гадавым колазвароце (зімовае і летняе сонцастаянні, веснавое і восеньскае раўнадзенствы).

У міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне бінарная апазіцыя *спрыяльны – неспрыяльны* выразна раскрывае дуальны прынцып існавання феномена часу і падкрэслівае абрадавы статус актуалізуемых форм часу [5; 6; 7; 11; 12; 13; 15; 16; 19; 20].

3. Феномен часу адлюстраваў наяўнасць існавання розных канфігурацый тэмпаральнасці, якую задавала прыродна-касмічная цыклічнасць. Рух Сонца па небасхіле стаў узорам завершанага касмічнага цыкла працягласцю ў год і быў пакладзены ў аснову фарміравання сакральнага традыцыйнага календара. Сімвалам згорнутага прататыпу года з захаваннем асноўных этапаў развіцця сталі суткі, якія ўступалі ў складаныя ўзаемаадносіны з іншымі структурнымі адзінкамі часу і прадвызначалі характар дыхатаміі сакральнага і прафаннага часу. Менш працяглы па часе, але больш дынамічны па тэмпарытме цыкл змены фазаў Месяца ўплываў на сацыяпрагматыку чалавечай дзейнасці і стаў касмічнай праекцыяй каляндарнага месяца і тыдня.

Структурна-функцыянальны аналіз міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыны беларусаў выявіў зместавае падабенства рознамаштабных адзінак часу і засведчыў, што яны надзяляюцца тоеснымі каштоўнаснымі характарыстыкамі з улікам апазіцыі «спрыяльны – неспрыяльны». Чатырохтактная матрыца гадавога (зімовае – летняе сонцастаянні, веснавое – восеньскае раўнадзенствы), месяцовага (маладзік – збыта, поўня – межы), сутачнага (усход – захад, поўдзень – поўнач)

структурыравання і выкарыстанне канфігурацыі піраміды дазволіла выявіць не толькі часавае, але і прасторавае (усход – захад, поўдзень – поўнач) падабенства характарыстык рознамаштабных працягласцей. Гэта стала сведчаннем, што ў іх аснове ляжаў адзін і той жа касмаганічны міф, галоўнай зместаўтваральнай ідэяй якога быў прынцып непадзельнасці прасторава-часавага кантынуума і наяўнасці амбівалентнасці яго вызначальных маркёраў [1; 8; 17; 18; 23].

4. Міфалагічныя аспекты традыцыйных каляндарных практык былі арыентаваны на пастаянны зварот да касмаганічных вытокаў (цыклічная форма існавання часу) з мэтай захавання першапачатковай упарадкаванасці светабудовы. У аснову хрысціянскай канцэпцыі разумення часу пакладзена прынцыпова іншая ідэя. Праз сімвалічнае спыненне часу вяртання да эпохі Першастварэння хрысціянская Пасха (Вялікдзень) распачала новую эру ў жыцці чалавецтва, у якой час набыў вектарную накіраванасць у будучыню. Аднак хрысціянскае лінейнае разуменне часу канчаткова не страціла сувязь з першапачатковай ідэяй космапланетарнай цыклічнасці: а) разлікі часу штогадовага святкавання Вялікадня абапіраюцца на структурную суаднесенасць цыклаў Сонца і Месяца; б) біблейскі гістарычны час – лінейны ў сваёй аснове – утрымлівае ідэю эсхаталагічнай закальцаванасці.

Комплекс рытуальна-абрадавых практык сямейна-родавай накіраванасці разгортваецца ў адпаведнасці з спецыфічнай разнавіднасцю лінейнага часу, аснову якой складае тэмпарытм «1-ы, 3-і, 9-ы, 40-ы дзень, 1 год». Пры гэтым кожны з абрадаў надзелены адпаведным семіятычным статусам, які вызначаў характар узаемаадносін з цыклічнасцю каляндарных падзей: час правядзення вяселля падпарадкоўваўся рэгламентацыям народна-праваслаўнага календара; дзень нараджэння дзіцяці ўключаўся ў яго структуру; пахавальна-памінальныя абрады прыпынялі або ўвогуле адмянялі магчымасць актуалізацыі іншых рытуалаў роўна на год.

Шматвяковае суіснаванне міфалагічнай і хрысціянскай канцэпцый разумення часу прывяло да таго, што праваслаўная Пасхалія падпарадкавала сабе цыкл веснавых святаў беларускага народнага календара, чым парушыла іх адвечную прыродна-касмічную суаднесенасць, а тэмпарытм «1-ы, 3-і, 9-ы, 40-ы дзень, 1 год» аказаў уплыў на структуру паслявялікоднага сегмента Пасхаліі [2; 4; 14; 21].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Асноўныя вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры рэалізацыі дзяржаўных праграм, накіраваных на стратэгію ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, развіццё культуры як крыніцы духоўнага здароўя нацыі і сацыяльнай стабільнасці як аднаго з галоўных прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі, а таксама ў падрыхтоўцы культуролагаў, спецыялістаў сферы культуры і мастацтва на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Навуковыя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца ў далейшых навуковых распрацоўках, прысвечаных вывучэнню

міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыны як беларускага, так і іншых народаў, у распрацоўцы адукацыйных праграм, скіраваных на міжкультурнае ўзаемадзеянне, у вучэбна-метадычным забеспячэнні лекцыйных курсаў адукацыйных устаноў. Асноўныя вынікі даследавання ўкаранёны і выкарыстоўваюцца ў працэсе выкладання вучэбных дысцыплін «Культурна-гістарычныя тыпы цывілізацый: фальклор і сучаснасць» для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 04 01-02 02 «Менеджмент міжнародных культурных сувязей», для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 04 01-02 03 «Менеджмент рэкламы і грамадскіх сувязей»; «Святочная культура беларусаў» для студэнтаў спецыяльнасці 1-17 01 05-02 «Рэжысура свят (тэатралізаваныя)» ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», аб чым сведчаць 2 акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 23.04.2020, 10.12.2020, а таксама ў дзейнасці метадычных цэнтраў народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы, што пацвярджаюць 2 акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 02.12.2019, 05.12.2019.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА


### Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах

1. Катовіч, А. В. Сімволіка структурных адзінак сутак ў міфапаэтычнай спадчыне беларусаў / А. В. Катовіч // Роднае слова. – 2010. – № 9. – С. 104–107.

2. Катовіч, А. В. Этнанацыянальныя асаблівасці асэнсавання часу святкавання вяселляў беларускай моладзі: традыцыйны і сучасны кантэксты / А. В. Катовіч // Современная молодежь и общество. – Мінск, 2019. – Вып.7 : В диалоге стран и культур: исторический опыт и современность. – С. 79–84.

3. Катовіч, А. В. Дыхатамія архетыпічнага Часу Вечнасці і цыклічнага сакральнага часу ў абрадавых практыках беларусаў «Гулянне ў свячу» / А. В. Катовіч // Искусство и культура. – 2019. – №4 (36). – С. 81–85.

4. Катовіч, А. В. Фенаменалогія кантынуума «трыдзевятага царства» і ўніверсума лінейнага часу ў традыцыйнай культуры беларусаў / А. В. Катовіч // Роднае слова. – 2019. – № 12. – С. 71–74; 2020. – № 1. – С. 82–86.

5. Катовіч, А. В. Структурна-семантычныя аспекты парогавага часу семіясферы абрадаў пераходнага тыпу / А. В. Катовіч // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2020. – № 1 (35). – С. 52–61.

6. Катовіч, А. В. Рэгенератыўная функцыя кампрэсіі часу ў аднаўленні адносін паміж космасам і чалавекам / А. В. Катовіч // Роднае слова. – 2020. – № 3. – С. 85–88; 2020. – № 4. – С. 89–92.

7. Катовіч, А. В. Каляндарныя абрады навалецця – згорнутая мадэль аднаўлення міфалагічнага часу / А. В. Катовіч // Роднае слова. – 2021. – № 2. – С. 78–82.

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах (па іншых напрамках)

8. Катовіч, А. В. Асэнсаванне часу ў міфапаэтычнай спачыне беларусаў: семантыка і сімволіка тыдня / А. В. Катовіч // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : [зб. навук. арт.] / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2010. – Вып. 8. – С. 341–346.

9. Катовіч, А. В. Асаблівасці абрадавай трансфармацыі прафаннага часу ў сакральны : традыцыйная практыка беларусаў / А. В. Катовіч // Народная асвета. – 2010. – № 10. – С. 79–83.

10. Катовіч, А. В. Асаблівасці суіснавання сакральнага і прафаннага часу : традыцыйная практыка беларусаў / А. В. Катовіч // Народная асвета. – 2010. – № 11. – С. 93–96.

11. Котович, О. В. Этнокультурный феномен «цыганоў» в пространственно-временном континууме обрядовой практики белорусов / О. В. Котович // Пытанні

мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : [зб. навук. арт.] / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2012. – Вып. 13. – С. 393–399.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

12. Катовіч, А. В. «Варвараўская свечка» – рэгіянальныя святы даўніх беларускіх плямёнаў, або другое кола каляндарных святкаванняў / А. В. Катовіч // Гісторыя Магілёва : мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац VII Міжнар. навук. канф., 29–30 чэрв. 2011 г. / уклад.: А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў, 2011. – С. 74–81.

13. Котович, О. В. Ритуальные костры в традиционной обрядовой практике белорусов: семантические и структурно-функциональные аспекты / О. В. Котович // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. : XI Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 4 мая 2017 г.) / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2017. – Вып. 11. – С. 277–282.

14. Катовіч, А. В. Асэнсаванне лінейнага часу ў міфапаэтычнай спадчыне і абрадавай практыцы усходніх славян / А. В. Катовіч // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. по материалам третьей Междунар. науч. конф. (Пинск, 30 нояб. – 1 декаб. 2018 г.) / Полес. гос. ун-т ; под ред. Р.Б. Гагуа. – Пинск : ПолесГУ, 2018. – Вып. 3. – С. 296–303.

15. Катовіч, А. В. Узаемаадносіны міфалагічнага і рытуальнага часу як праяўленне сацыяльнай рэгулятыўнасці (на прыкладзе традыцыйнай абрадавай практыкі «Свяча») / А. В. Катовіч // Культура Беларусі: реалии современности : VIII Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. Году малой родины в Респ. Беларусь (Минск, 10 окт. 2019 г.) : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2019. – С. 223–230.

16. Катовіч, А. В. Культуралагічная парадыгма рэверсіўнасці часу : ад дэсакралізацыі міфа да сакралізацыі фальклорнага дыскурса / А. В. Катовіч // Культура. Навука. Творчасць : XIV Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 75-летию Великой Победы и 45-летию Белорус. гос. ун-та культуры и искусств (Минск, 14 мая 2020 г.) : зб. навук. арт. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2020. – Вып. 14. – С. 233–239.

17. Катовіч, А. В. Іерафанія месяца як структураўтваральны фактар парадкавання часу / А. В. Катовіч // Сучасні тенденції розвитку освіти й науки: проблеми та перспективи : зб. наук. праць / [гол. ред. Ю. І. Колісник-Гуменюк]. – Київ–Львів–Бережани–Гомель, 2020. – Вип. 7. – С. 188–197.

### Матэрыялы навуковых канферэнцый

18. Катовіч, А. В. Сакральны час у міфапаэтычнай спадчыне і абрадавай практыцы беларусаў: структура сутак / А. В. Катовіч // Романовские чтения – 6 (к 75-летию исторического факультета УО «МГУ им. А.А. Кулешова») : сб. ст. Междунар.

науч. конф. (Могилев, 24–25 нояб. 2009 г.) ; редкол. : И. А. Марзалюк [и др.]. – Могилев, 2010. – С. 102–103.

19. Катовіч, А. В. Уяўленні аб спрыяльным і неспрыяльным часе у рукапісных каляндарных спісах беларусаў / А. В. Катовіч // Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы : материалы VII Междунар. науч. конф. (Гомель, 26–27 мая 2011 г.) : в 2 ч. / под общ. ред. В. В. Кириенко. – Гомель : ГГТУ им. П.О. Сухого, 2011. – Ч. 1. – С. 162–164.

20. Котович, О. В. Обрядовая практика обрекания в координатах сакральной географии Беларуси : пространственно-временные и семантико-символические аспекты / О. В. Котович // Духовно-нравственные концепты русской словесности в современной языковой, культурной и образовательной практике российско-белорусско-украинского пограничья : материалы Междунар. науч. конф. (Новозыбков, Россия, 25–26 окт. 2016 г.) / под ред. С. Н. Стародубец, В. Н. Пустовойтова. – Новозыбков, 2016. – С. 143–149.

21. Катовіч, А. В. Лінейная сістэма структуравання часу: Хрысціянская Пасхалія і традыцыйны каляндар беларусаў / А. В. Катовіч // Молодежь: свобода и ответственность : материалы Респ. науч.-практ. конф. (Барановичи, 28 февр. 2019 г.) / Баранович. гос. ун-т. – Барановичи, 2019. – С. 266–269.

22. Котович, О. В. Между профанным и сакральным: интерференция времени в системе постов народно-христианского календаря / О. В. Котович // Молодежь: свобода и ответственность : материалы Респ. науч.-практ. конф. (Барановичи, 28 февр. 2019 г.) / Баранович. гос. ун-т. – Барановичи, 2019. – С. 262–266.

23. Котович, О. В. Космос и время культуры: гармония отношений Солнца и Луны (аксиологический аспект) / О. В. Котович // Этническая культура в современном мире : материалы VI Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 100-летию образования Чуваш. автоном. обл. / Чуваш. гос. ин-т культуры и искусств ; ред. кол. Л. П. Кураков (гл. ред.) [и др.]. – Вып. 1. – Чебоксары, 2020. – С. 54–60.

## РЭЗЮМЭ

**КАТОВІЧ АКСАНА ВЕНІЯМІНАЎНА**

## УВАСАБЛЕННЕ ФЕНОМЕНА ЧАСУ Ў МІФАПАЭТЫЧНАЙ І РЫТУАЛЬНА-АБРАДАВАЙ СПАДЧЫНЕ БЕЛАРУСАЎ

**Ключавыя словы**: феномен часу, міфапаэтычная спадчына, рытуальна-абрадавыя практыкі, формы часу, цыклічны і лінейны час, неаднароднасць часу, структурныя адзінкі часу, каштоўнасныя характарыстыкі часу.

**Мэта даследавання:** выяўленне асаблівасцей увасаблення феномена часу ў міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыне беларусаў

**Метады даследавання.** Дысертацыя грунтуецца на комплексным і культуралагічным падыходах да даследавання феномена часу як найважнейшага элемента міфапаэтычнай карціны свету. Формы ўвасаблення і сістэма традыцыйных адзінак часу былі разгледжаны з пазіцый структурна-функцыянальнага падыходу. Для аналізу якасцей, асаблівасцей існавання, шляхоў актуалізацыі розных форм часу і фарміравання іх каштоўнасных характарыстык выкарыстаны метад сістэмнага аналізу, тэарэтычныя палажэнні псіхааналітычнай канцэпцыі, канцэпцыі класічнай сацыялогіі, фенаменалогіі культуры. Метад палявых даследаванняў даў магчымасць разгледзець праяўленне неаднароднасці абрадавага часу і эвалюцыі каштоўнасных характарыстык адзінак часу на сучасным этапе існавання традыцыі.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Дысертацыя з'яўляецца першым комплексным культуралагічным даследаваннем феномена часу ў міфапаэтычнай спадчыне і рытуальна-абрадавых практыках беларусаў. Вызначаны асаблівасці канстытуіравання часу як сакральнай Вечнасці і прафаннай быційнасці; раскрыты абрадавыя кантэксты праяўлення неаднароднасці часу; выяўлены канфігурацыі і тоеснасць каштоўнасных характарыстык структурных адзінак салярнай і месяцовай цыклічнасці; ахарактарызаваны асаблівасці суіснавання цыклічнай і лінейнай форм часу ў традыцыйных рытуальна-абрадавых практыках і праваслаўнай Пасхаліі хрысціянскага календара. У тэкст уведзены экспедыцыйны матэрыял, сабраны дысертантам.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Навуковыя палажэнні і высновы могуць стаць падставай для далейшых навуковых распрацовак, прысвечаных вывучэнню міфапаэтычнай і рытуальна-абрадавай спадчыны як беларускага, так і іншых народаў. Матэрыялы даследавання могуць выкарыстоўвацца ў падрыхтоўцы культуролагаў, спецыялістаў сферы культуры і мастацтва на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі; у дзейнасці метадычных цэнтраў народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы.

**Галіна выкарыстання:** культуралогія, тэорыя і гісторыя культуры, культурная антрапалогія, фальклярыстыка, этнаграфія.

# РЕЗЮМЕ

## КОТОВИЧ ОКСАНА ВЕНИАМИНОВНА

## ВОПЛОЩЕНИЕ ФЕНОМЕНА ВРЕМЕНИ В МИФОПОЭТИЧЕСКОМ И РИТУАЛЬНО-ОБРЯДОВОМ НАСЛЕДИИ БЕЛОРУСОВ

**Ключевые слова:** феномен времени, мифопоэтическое наследие, ритуально-обрядовые практики, формы времени, неоднородность времени, структурные единицы времени, ценностные характеристики времени.

**Цель исследования:** выявление особенностей воплощения феномена времени в мифопоэтическом и ритуально-обрядовом наследии белорусов.

**Методы исследования.** Диссертация основывается на комплексном и культурологическом подходах к исследованию феномена времени как важнейшего элемента мифопоэтической картины мира. Формы воплощения и система традиционных единиц времени были рассмотрены с позиций структурно-функционального подхода. Для анализа качеств, особенностей существования, путей актуализации различных форм времени и формирования их ценностных характеристик использован метод системного анализа, теоретические положения психоаналитической концепции, концепции классической социологии, феноменологии культуры. Метод полевых исследований дал возможность рассмотреть проявление неоднородности обрядового времени и эволюции ценностных характеристик единиц времени на современном этапе существования традиции.

**Полученные результаты и их новизна.** Диссертация является первым комплексным культурологическим исследованием феномена времени в мифопоэтическим наследии и ритуально-обрядовых практиках белорусов. Определены особенности конституирования времени как сакральной Вечности и профанной бытийности; раскрыты обрядовые контексты проявления неоднородности времени; выявлены конфигурации и тождественность ценностных характеристик структурных единиц солярной и лунарной цикличности; охарактеризованы особенности сосуществования циклической и линейной форм времени в традиционных ритуально-обрядовых практиках и православной Пасхалии христианского календаря. В текст введен экспедиционный материал, собранный диссертантом.

**Рекомендации по использованию.** Научные положения и выводы могут стать основанием для дальнейших научных разработок, посвященных изучению мифопоэтического и ритуально-обрядового наследия как белорусского, так и других народов. Материалы исследования могут использоваться в подготовке культурологов, специалистов сферы культуры и искусства на уровне среднего специального и высшего образования; в деятельности методических центров народного творчества и культурно-просветительской работы.

**Область использования:** культурология, теория и история культуры, культурная антропология, фольклористика, этнография.

## SUMMARY

### THE KATOWICE OKSANA VENIAMINOVNA

### THE EMBODIMENT OF THE PHENOMENON OF TIME IN THE MYTHOPOETIC AND RITUAL HERITAGE OF BELARUSIANS

**Keywords:** the phenomenon of time, mythopoetic heritage, ritual and ritual practices, forms of time, heterogeneity of time, structural units of time, value characteristics of time.

**The purpose:** identification of the features of the embodiment of the phenomenon of time in the mythopoetic and ritual-ceremonial heritage of Belarusians.

**Research methods.** The dissertation is based on a comprehensive and cultural studies approaches of the phenomenon of time as the most important element of the mythopoetic picture of the world. The forms of embodiment and the system of traditional units of time were considered from the standpoint of a structural and functional approach. To analyze the qualities, features of existence, ways of actualization of various forms of time and the formation of their value characteristics, the method of system analysis, theoretical provisions of the psychoanalytic concept, the concept of classical sociology, cultural phenomenology were used. The method of field research made it possible to consider the manifestation of the heterogeneity of ritual time and the evolution of the value characteristics of time units at the present stage of the tradition's existence.

**The results of the study and their scientific novelty.** The dissertation is the first comprehensive cultural study of the phenomenon of time in the mythopoetic heritage and ritual practices of Belarusians. The features of the construction of time as sacred Eternity and profane beingness are determined; the ritual contexts of the manifestation of the heterogeneity of time are revealed; configurations and identity of value characteristics of structural units of solar and lunar cyclicity are revealed; the features of the existence of cyclic and linear forms of time in traditional ritual and ceremonial practices and the Orthodox Paschalia of the Christian calendar are characterized. Expeditionary material collected by the dissertator is included in the text.

**Recommendations for use.** Scientific statements and conclusions can become the basis for further scientific developments devoted to the study of the mythopoetic and ritual-ceremonial heritage of both the Belarusian and other peoples. The research materials can be used in the training of culturologists, specialists in the field of culture and art at the level of secondary specialized and higher education; in the activities of methodological centers of folk art and cultural and educational work.

**Field of application:** cultural studies, theory and history of culture, cultural anthropology, folklore studies, ethnography.

Навуковае выданне

**КАТОВІЧ АКСАНА ВЕНІЯМІНАЎНА**

**УВАСАБЛЕННЕ ФЕНОМЕНА ЧАСУ
Ў МІФАПАЭТЫЧНАЙ І РЫТУАЛЬНА-АБРАДАВАЙ
СПАДЧЫНЕ БЕЛАРУСАЎ**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі
па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

Падпісана ў друк 31.01.2022. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,71.
Тыраж 60 экз. Заказ 732.

Паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.